них. В 2018 году в нашей стране утонуло 310 человек. Как правило, это люди трудоспособного возраста, среди них 50 % утонувших – люди не умеющие плавать. Следовательно, примерно половина пострадавших плавать умели, но не соблюдали элементарные правила поведения на воде. Можно предположить, что увеличение количества часов на изучения раздела программы «Прикладное плавание» будет способствовать уменьшению количества несчастных случаев.

Неожиданные или сложные ситуации на воде могут вызвать у неопытного пловца растерянность и страх, что является одной из основных причин неправильных действий и гибели людей.

Первоочередными задачами обучения студентов являются приобретение необходимых знаний, умений и навыков по предупреждению травм и несчастных случаев, спасению тонущих и оказанию первой доврачебной помощи пострадавшим на воде, использованию навыков плавания и ныряния в прикладных целях. Все эти направления в учебной работе по плаванию отражают методику профессиональной подготовки студентов в современных условиях.

***Литература***


1. Васильева Н. М. Овладение элементами прикладного плавания как основа безопасного поведения на воде [Текст] // Теория и практика образования в современном мире: материалы междунар. науч. конф. (г. Санкт-Петербург, февраль 2012 г.). – СПб.: Реноме, 2012. – С. 98–99.
2. Гузман, Р. Плавание. Упражнения для обучения и улучшения техники : пер. с англ. / Р. Гузман. – Минск : Попурри, 2018. – 288 с.
3. «Белорусское республиканское общество спасания на водах» (ОСВОД) [Электронный ресурс] / Республиканского государственно-общественного объединения. – Режим доступа: http://osvod.www.by. – Дата доступа: 08.09.2019.


## ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ВЫКАРЫСТАННЯ НАРОДНЫХ ГУЛЬНЯЎ У ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОЦЕ СА ШКОЛЬНІКАМІ: ПРЫЁМЫ ТРАНСФАРМАЦЫІ


***Дрыгін А.В.***

*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*



In the article the use of game is examined as one of methods of educating and transmission of experience is used from antiquity. In modern educational organizations support is done on intensification and activation of educator-educational process, in this connection, a game is all more often used as an effective method of educating.


Народная гульня – гэта сацыяльна-культурны феномен, у якім адбываецца ўмоўнае адлюстраванне рэчаіснасці, таму лепшыя ўзоры народнай фізічнай культуры, працоўнай дзейнасці, педагогіцы не толькі не знікаюць у гульнях, але і беражліва зберагаюцца, пераасэнсоўваюцца, набываюць новае значэнне. Народныя гульні ў выхаваўчай рабоце са школьнікамі – гэта комплекс педагагічных уздзеянняў з боку выхавацеляў, якія садзейнічаюць развіццю фізічных, разумовых, валявых, маральных якасцей, а таксама псіхічных працэсаў дзяцей і падлеткаў.

Сёння зварот да тэмы беларускіх нацыянальных традыцый у выхаваўчай рабоце са школьнікамі з’яўляецца дастаткова актуальным, паколькі не падлягае сумненню той факт, што традыцыя – гэта тое, што звязвае пакаленні і забяспечвае перадачу назапашанай стагоддзямі інфармацыі, уплывае на фарміраванне ідэйна-эстэтычных ідэалаў у школьнікаў, іх светапогляду, сістэмы пачуццяў, уяўленняў аб сваёй прыналежнасці да беларускага этнасу.

Калі разглядаць паняцце “гульня” ў кантэксце суадносін традыцый і сучаснасці, то ў народнай культуры гульня мае больш шырокае значэнне. Такія з’явы, як вечарыны, пляскі, забавы, ігрышчы, карагоды, сустрэчы моладзі для весялосці, свавольствы, называліся “гульнямі” [2, с.15]. Для беларусаў гульня не ўспрымалася асобна, яна пранікала ва ўсе сферы жыцця: была арганічна звязана як з абраднасцю, так і з паўсядзённасцю.

У сучасны момант гульня згубіла сваё рытуальна-абрадавае значэнне, яна ў значнай меры ўжо не ўспрымаецца як школа зносін ці выхавання маральнасці і для большасці школьнікаў з’яўляецца выключна спосабам правядзення вольнага часу. Нягледзячы на тое, што народная гульня ўвабрала ў сябе вопыт фізічнага, маральнага, эстэтычнага, працоўнага, сямейнага выхавання, якое было выпрацавана многімі пакаленнямі, зараз яна не ў поўнай меры выкарыстоўваецца ў сучаснай адукацыйнай прасторы. Але дзякуючы сваім шырокім магчымасцям, якія накіраваны на развіццё фізічных, разумовых якасцей, псіхалагічных асаблівасцей асобы школьніка, на фарміраванне маральных установак, светапогляду, сістэмы адносін і пачуццяў, магчымасцей выканання чалавекам адпаведных жыццёвым сітуацыям дзеянняў, на выхаванне любові і пашаны да сваёй зямлі, спадчыны, роднай культуры, гульня заўсёды займала важнае месца ў сістэме перадачы вопыту ад пакалення да пакалення і пакінула свой адбітак не толькі ў народнай, але і ў прафесійнай педагогіцы. Вартасць народнай гульні ў працэсе фарміравання і станаўлення ўсебакова гарманічна развітай асобы не падлягае сумненню. А гэта і ёсць рэалізацыя фундаментальнай задачы адукацыі. Таму педагагічны працэс павінен арыентавацца на вывучэнне і выкарыстанне беларускіх народных гульняў і на іх адаптацыю да сучасных умоў выхаваўчай работы са школьнікамі.

Пры гэтым неабходна ўлічваць умовы найбольш эфектыўнага выкарыстання народнай гульні ў выхаваўчай рабоце са школьнікамі:

1. Пры выбары і арганізацыі гульні ў выхаваўчым працэсе неабходна, каб ажыццяўляўся (улічваўся) ўзроставы падыход. Змест, форма, спосабы арганізацыі гульні павінны адпавядаць узросту гульцоў, іх фізічным і разумовым магчымасцям з улікам арыентацыі на зону актуальнага і зону бліжэйшага развіцця.
2. Неабходна абапірацца на цікавасць гульні, якая павінна тонка і эфектыўна ўлічваць патрэбы маладога чалавека ва ўражаннях і эмацыянальным кантакце. Цікавая па зместу гульня правакуе цікавасць да працэсу “гуляння”, а тым самым і неасэнсаваны, падсвядомы інтарэс да працэсу выхавання.
3. Неабходна так арганізаваць выхаваўчы працэс, каб народная гульня садзейнічала ўмацаванню духоўнага кантакту паміж людзьмі, паміж выхавацелем і выхаванцам, настаўнікам і вучнем. Менавіта ў працэсе гульні, імітуючы дзеянні, паводзіны, прымяраючы на сябе сацыяльныя ролі, школьнік авалодвае ведамі, уменнямі,

навыкамі і тым самым ажыццяўляецца перадача вопыту, захаванне традыцый, няхай і адаптаваных да сучаснасці, і забяспечваецца пераемнасць пакаленняў. Таксама народная гульня стварае выхаваўчую сітуацыю, якая забяспечвае фарміраванне ў чалавека станоўчага вопыту зносін у сацыяльным асяроддзі.

4. Гульня павінна забяспечыць стымуляцыю да самаўдасканалення яе ўдзельнікаў, заахвочванне да самаразвіцця асобы. Яна павінна садзейнічаць фарміраванню ўнутранай матывацыі школьніка да асабістага развіцця, да актывізацыі пазнаваўчых працэсаў, да развіцця культуры пачуццяў і камунікатыўных якасцей, што дазваляе засвойваць новы вопыт і лепш арыентавацца ў навакольным асяроддзі. Пры арганізацыі народнай гульні, неабходна так прадумаць яе змест, форму, характар, каб выклікаць у школьніка ўласнае пабуджэнне да авалодання пэўнымі ведамі, уменнямі ці навыкамі. Такім чынам, праз гульню павінны сфарміравацца розныя віды матываў: інтарэс да пазнання, імкненне да канкрэтнага выніку, імкненне авалодаць працэсам дзейнасці, атрымаць ад яго асалоду, а таксама матывы да самаўдасканалення, самавызначэння і г. д.
5. Народная гульня ў выхаваўчым працэсе павінна забяспечваць адзінства духоўнага і фізічнага развіцця школьніка. Духоўнае развіццё праз народную гульню ажыццяўляецца асэнсаваннем глыбіні і самабытнасці, архаічнасці і варыятыўнасці традыцыйнай культуры беларускага народа, яе вывучэннем і трансфармацыяй да сучасных умоў. Бясспрэчныя магчымасці народнай гульні і для фізічнага развіцця асобы, паколькі ў працэсе гульні фарміруюцца такія якасці як спрытнасць, хуткасць, моц, вынослівасць, а таксама ствараюцца ўмовы для ўмацавання здароўя ўдзельнікаў, што забяспечвае папулярызацыю здаровага ладу жыцця.
6. Гульня павінна даваць школьніку магчымасць свабоднага развіцця сваіх творчых здольнасцей. У працэсе гульні чалавек павінен раскрываць, праяўляць і развіваць свой творчы патэнцыял, свае задаткі і творчыя магчымасці, накіроўваючы іх на развіццё таленту. Гэта магчыма толькі пры спрыяльных умовах і свабоднай атмасферы, якую і стварае народная гульня ў выхаваўчым працэсе.

Абапіраючыся на гэтыя ўмовы, забяспечваючы іх выкананне, мэтазгодна выкарыстанне народнай гульні ў наступных накірунках выхаваўчай работы са школьнікамі: у фізкультурна-аздараўленчай рабоце, у сцэнічна-мастацкай і ў культурна-масавай дзейнасці.

Паколькі выхаваўчы працэс з’яўляецца зменшанай, часам, схематычнай мадэллю рэчаіснасці, які рыхтуе школьніка да самастойнага жыцця ў грамадстве, то варта выкарыстоўваць народную гульню ў педагагічнай дзейнасці. Гэта павінна адбывацца з улікам вышэй азначаных умоў, а таксама з апорай на прынцыпы дыдактыкі і тэорыі выхавання, з выкарыстаннем метадаў і прыёмаў педагогікі, з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей школьнікаў.

Ужыванне гульні ў выхаваўчым працэсе амаль заўсёды прадугледжвае неабходнасць уносіць істотныя змены ў змест, форму, характар гульні з мэтай прыстасавання да ўмоў яе выкарыстання, а таксама з мэтай рэалізацыі пастаўленных задач. Таму ўзнаўленне і выкарыстанне народных гульняў у розных накірунках выхаваўчай работы са школьнікамі патрабуе ад выхавацеляў ведання метадалагічнай базы трансфармацыйнага працэсу народных гульняў.

Асноўнымі прыёмамі трансфармацыі народных гульняў для выкарыстання ў выхаваўчай рабоце са школьнікамі з'яўляюцца:

- **скарачэнне** – адкідванне некаторых гульнёвых элементаў па прычыне іх непатрэбнасці, неактуальнасці, складанасці або залішняй спрошчанасці, немагчымасці іх суаднясення з умовамі правядзення гульні;
- **пашырэнне** – увядзенне новых гульнёвых элементаў для прыстасавання да гульнёвай прасторы, для паляпшэння відовішчнасці гульні, для каардынацыі агульнай (фізічнай, разумовай, псіхалагічнай) нагрузкі ўдзельнікаў;
- **інтэнсіфікацыя** – выдзяленне і ўзмацненне значэння пэўных гульнёвых дзеянняў па прычыне зручнасці або неабходнасці іх выканання;
- **паслабленне** – памяншэнне значнасці гульнёвых момантаў, якія не адпавядаюць існуючым умовам або магчымасцям удзельнікаў;
- **ракіроўка** – структурнае змяненне гульнёвага дзеяння, пры якім элементы гульні мяняюцца месцамі;
- **замена** – выкарыстанне новых гульнёвых элементаў замест тых, якія не адпавядаюць асаблівасцям ужывання народнай гульні ў розных накірунках выхаваўчай работы;
- **асіміляцыя** – змяненне народнай гульні пад уздзеяннем увядзення новых элементаў або іх падпарадкавання існуючым гульнёвым правілам.

Такім чынам, выкарыстанне дадзеных прыёмаў трансфармацыі народнай гульні павінна забяспечыць яе прыстасаванне да ўмоў арганізацыі выхаваўчай работы са школьнікамі і эфектыўнасць уздзеяння гульні на выканаўцаў і гледачоў, а таксама стварыць адпаведную атмасферу традыцыйнасці, праз якую і магчыма ажыццяўленне выхаваўчых, пазнаваўчых і развіваючых задач.

Аднак, кожны накірунак выхаваўчай работы ў школе мае спецыфічныя асаблівасці, якія накладваюць свае патрабаванні да працэсу падрыхтоўкі, арганізацыі і правядзення мерапрыемства ці праграмы з выкарыстаннем народных гульняў і якія неабходна ўлічваць пры выбары, арганізацыі і правядзенні народнай гульні з мэтай яе найбольш эфектыўнага ўздзеяння на асобу школьніка.

### Літаратура


1. Вількін, Я.Р. Беларускія народныя гульні. Мінск : Беларусь, 1996. 86 с.
2. Гульні, забавы, ігрышчы / склад. А.Ю. Лозка. 2-е выд. Мінск : Беларуская навука, 2000. – 534 с.
3. Лозка, А.Ю., Дрыгін, А.В. Беларуская фальклярыстыка : Народныя гульні. Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2012. – 176 с.
4. Дрыгін, А.В. Спартыўна-адукацыйны праект БДПУ "Беларусіяда" (беларускія народныя гульні). Мінск : Беларус. дзярж. пед. ун-т, 2018. – 16 с.